ЦБС г. Гродно

Гродзенская гарадская
цэнтральная бібліятэка
імя А. Макаёнка

Жыццё і творчасць Майстра:
заслужаны дзеяч мастацтваў
Рэспублікі Беларусь,
скульптар

# Уладзімір Церабун



Жыццё і творчасць Майстра: заслужаны дзеяч мастацтваў Рэспублікі Беларусь, скульптар Уладзімір Церабун: [біябібліяграфічнае выданне] / Гродзенская гарадская цэнтральная бібліятэка імя А. Макаёнка; уклад. Н. Р. Свірыда, Т. А. Шыбут. – Гродна, 2015. – 25 с.

*Выпуску выдання папярэднічала вялікая пошукавая работа. Біяграфічны нарыс складаўся на аснове ўжо апублікаванага ў сродках масавай інфармацыі матэрыялу і ва ўмовах цеснага супрацоўніцтва з Церабуном У. В., які прадаставіў фота і дакументы з асабістага архіву. Для складання бібліяграфічнага спісу былі выкарыстаны электронныя каталогі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, Гродзенскай абласной навуковай бібліятэкі імя Я. Ф. Карскага, Гродзенскай гарадской цэнтральнай бібліятэкі імя А.Я. Макаёнка, электронныя сродкі масавай інфармацыі, а таксама спіс публікацый, складзены асабіста У.В. Церабуном.*

*Выданне будзе карысна гісторыкам, культуролагам, мастацтвазнаўцам, выкладчыкам і настаўнікам навучальных устаноў са спецыялізацыяй “Культура і мастацтва”, студэнтам, школьнікам і ўсім, хто цікавіцца беларускім мастацтвам.*



# УЛАДЗІМІР ВАСІЛЬЕВІЧ ЦЕРАБУН, СЯБРА БЕЛАРУСКАГА САЮЗА МАСТАКОЎ, СКУЛЬПТАР, ЗАСЛУЖАНЫ ДЗЕЯЧ МАСТАЦТВАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

***Лаўрэат прэміі Ленінскага камсамолу БССР (1976 год), з 1977 года сябра Беларускага саюза мастакоў, узнагароджаны медалём «За працоўную доблесць» (г.Масква, 1986 год), з 1993 года Ганаровы грамадзянін горада Смаргонь, у 2007 годзе атрымаў званне «Заслужаны дзеяч мастацтваў Рэспублікі Беларусь». З 1973 да 2001 года жыў і працаваў у горадзе Гродна.***

## Біяграфічны нарыс

Нарадзіўся Уладзімір Васільевіч Церабун 11 красавіка 1946 года ў вёсцы Несцяняты Смаргонскага раёна Гродзенскай вобласці. Ён быў малодшым з шасці дзяцей. У працавітых гаспадароў Васіля Карнілавіча і Антаніны Антонаўны Церабуноў была вялікая сям'я. З успамінаў Уладзіміра Васільевіча:



Бацькі - Антаніна Антонаўна і Васіль Карнілавіч Церабуны

***– Калі мне было гады тры, бацька перавёз сям'ю на хутар пад Смаргонню. Трэба было некалькі кіламетраў хадзіць у школу пехатою ў любую непагадзь. Сям'я была вялікая: бацькі, дачка і пяць сыноў, я апошні з іх. Лічу, што гэта мела свій станоўчы плён. Затым бацька, які працаваў на лесазаводзе пілаточам, пабудаваў у Смаргоні дом, і ў нас пачалося новае жыццё.***

***Маці была вельмі лагодная, працавітая, добрая душой і сэрцам. Кожны дзень ёй трэба было варыць ежу на 8 чалавек. Тады ж і выбару такога, як цяпер, не было. Нават каб хлеб дастаць, маці з братам ішлі за ім у горад з хутара ў пяць гадзін раніцы. Але неяк хапала выдумкі, каб з нічога смачнае зварыць.***

***На абед бацьку заўсёды быў кавалачак мяса. Нават ужо дарослымі ніхто з нас не меў права ўзяць гэтае мяса, таму што бацька – гаспадар. Ён зарабляе грошы, корміць сям'ю і яму трэба лепшая ежа.***

***Ніхто бацькоў не называў на "ты". Ужо потым мы так звярталіся да маці, а***



Юра і Валодзя (справа) Церабуны з бацькамі

***з бацькам на “Вы” былі да апошняга. Ён быў вельмі гаспадарлівы, мудры, клапаціўся пра сям’ю. Але жылі мы ўсё роўна вельмі бедна.***

***Што датычыць гарэлкі, то гэта было настолькі ў меру, настолькі святочна! Каб у будні прыйсці і напіцца, то такога ў нашай сям’і ніколі не было. Сям’я была вельмі працавітая. Маці ткала на кроснах тканіну, кручком вязала з каляровых анучак дыванкі. Ніхто бязрукім не быў.***

Бацькі надавалі дзецям шмат увагі. Асабліва малодшым – Юрасю і Валодзю. Бацька бачыў іх здольнасці да выяўленчага мастацтва, музыкі і падтрымліваў гэта, як мог. Спачатку ён дастаў для дзяцей скрыпку. Але ніяк яе не маглі настроіць. Ужо потым высветлілася, што прычына была вельмі простая, нахіліўся адзін калок у сярэдзіне пад дэкай скрыпкі. Ведаць дзеці гэтага не ведалі і ціхенька аддалі скрыпку гаспадару, не прызнаўшыся, што не змаглі настроіць. Потым Васіль Карнілавіч набыў брату Юрыю акардэон. А калі дзеці ўжо былі студэнтамі, прывёз дамоў на санках у саломе нямецкае фартэпіяна, кандылябры. Калі ён размаўляў з гаспадаром інструмента, той так казаў: “Ведаеш, добры інструмент, як кулаком стукнеш, дык доўга гудзіць!”

***– Гэта павінна было значыць, што інструмент выключны,*** – з усмешкай успамінае Уладзімір Васільевіч. – ***Радасці была поўная хата. Юра займаўся ў музвучылішчы, умеў іграць. Ды і я быў аматарам.***

Але з фартэпіяна атрымалася тая самая гісторыя, што і са скрыпкай: перасохлі калкі, і інструмент не наладжваўся. У камісійны магазін яго здалі, каб хто для мэблі набыў.

Дзеці заўсёды знаходзілі нейкі занятак. Уладзімір займаўся ігрой на балалайцы і за сваю ігру на аглядзе-конкурсе ў Гродна атрымаў у падарунак фотаапарат. Першыя фотаздымкі аказаліся ўдалымі – так ён пачаў займацца фатаграфіяй.

Неяк школьнік Валодзя разам з пяццю сябрамі пайшоў разгружаць вагон з цэментам. Атрымалі хлопцы па 120 рублёў – вялікія грошы на той час. Будучы мастак іх патраціў на фотапавелічальнік, які лічыўся тады вялікай раскошай. Мастацтва фатаграфіі засталося сярод захапленняў Уладзіміра Васільевіча на доўгія гады, ён прадаўжае ствараць шматлікія цяпер ужо лічбавыя фота праз 50 гадоў пасля першага кадра.

Яшчэ адным захапленнем малодшых братоў былі авіямадэлі. Мастак успамінае:

***– Гэта ж было настолькі цікава! Мадэлі былі з маторам, з гумовым рухавіком. За 50 капеек можна было набыць кардонную каробку, у якой былі ўсе дэталі для таго, каб сабраць планёр. Першы раз набылі, сабралі, а ён ляцець не хоча. Аказалася, крылы павінны былі быць наперадзе ў самалёце, а мы пасярэдзіне паставілі. І колькі было радасці, калі планёр урэшце паляцеў.***

Рухавік да парахода дзеці набывалі праз газету “Зорка”. Пісалі ліст з просьбай, укладвалі рубель, а потым па пошце рухавік прыходзіў. Пасля хлопцы заняліся ракетабудаваннем, сталі запускаць змеяў. Рабілі іх і квадратнымі, і плоскімі, і каляровымі, і з хвастамі. Пускалі са змеяў парашуты. Пра захапленні Уладзімір Васільевіч успамінае ахвотна:

***– А якія канькі мы самі рабілі!? Да драўлянага бруска знізу ў канаўку замацоўвалі дрот, канцы загіналі і забівалі ў тарцы бруска. Затым прапякалі гарачым дротам шэсць дзірак – чатыры спераду, па дзве па баках і дзве ззаду (свердзелаў у нас не было). Затым заводзілі вяровачкі, зацягвалі калочкам, а вяровачкі ззаду закручвалі вакол валёнка. Гэтым канькам не было ні цаны, ні зносу. А лыжы выстругваў бацька, запарвалі ў гарачай вадзе канцы, затым іх разгіналі, сушылі – каталіся і радаваліся жыццю.***

***– Але былі і неразумныя крокі. Пасля вайны ў лясах вельмі шмат было снарадаў, гранат. Гэтыя снарады мы чаплялі дротам, цягнулі ў бліжэйшы бліндаж, палілі вогнішча і чакалі, пакуль выбухне. Аж зараз робіцца страшна, калі ўспамінаеш. Бог праявіў да нас літасць.***


Валодзя і Юра Церабуны гралі ў цымбальным аркестры

Уладзімір разам з братам Юрай гралі на цымбалах ў ансамблі песні і танца імя Агінскага. Уладзімір Васільевіч пра гэты час нагадвае:

***– Памятаю цікавы момант: займаючыся ў цымбальным аркестры, я бачыў, як дзецям нязручна трымаць цымбалы на каленях – яны заўсёды ссоўваліся ўніз. Я распрацаваў канструкцыю металічных ножак, якія закручваліся і выкручваліся, і мы шыкоўна выглядалі на Рэспубліканскім аглядзе мастацкай самадзейнасці ў Мінску ў 1963 годзе. Дзесяткі гадоў Барысаўская фабрыка музычных інструментаў выпускала цымбалы з маёй канструкцыяй. Пра патэнт я тыды не ведаў – мне проста хацелася дапамагчы дзецям.***

Потым прыйшоў час электрагітар. У Смаргоні з'явіўся мясцовы ”Бітлз” з удзелам Уладзіміра. З успамінаў дзяцінства:

***– Адзін музыка, Альгерд Апановіч, сябар майго брата, вельмі добра разбіраўся ў радыётэхніцы і далучыў спецыяльныя элементы да звычайнай гітары, каб гук быў як у электра. О, якая ж была радасць, калі свой Бітлз іграў танцы ў Смаргоні. І першая сола-гітара, гітара-рытм і бас-гітара, і барабаны, нават саксафаніст з Маладзечна прыязджаў. Цуд, ды і толькі!***

Ва ўсіх членаў творчай сям’і Церабуноў быў голас і музычны слых. І на Вялікдзень, і на Каляды ў доме гучалі сямейныя спевы. Ніхто нікога не вучыў, якую партыю трэба выконваць, але спевы атрымоўваліся цудоўныя. Часцей за ўсё спявалі беларускія і ўкраінскія песні.

***– Ніхто нікога не вучыў, якую партыю трэба цягнуць, але спевы атрымоўваліся цудоўныя, – дзівіцца сам скульптар. – Гэта было нашым багаццем. Мы спявалі беларуска-ўкраінскія песні, і ў іх была такая глыбіня, што гэта не магло на нас не адбівацца. Гэта было выхаванне прыгажосцю. Мы ўвесь час шукалі магчымасць праявіць сябе. Гэта аснова ўсяго.***


Аднакласнікі на экскурсіі ў Крэва. У.Церабун – трэці справа

Вучыўся Уладзімір Церабун у СШ № 1 г. Смаргонь. У школе і прыйшло захапленне скульптурай, чаму, магчыма, садзейнічала знаёмства з майстрам самадзейнай творчасці Аляксандрам Іванавічам Жываевым з вёскі Залессе. Ён заўважыў здольнасці хлопчыка, даў яму першыя ўрокі майстэрства. І яшчэ адзін чалавек паўплываў на лёс будучага мастака. Гэта культуролаг, музыка-аматар Аляксандр Анісімавіч Дзяруга. У яго Валодзя навучыўся бачыць прыгажосць

карцін, скульптур, графічных работ, фотаздымкаў. Пад уплывам гэтых людзей узніклі мары прысвяціць сваё жыццё скульптуры і мастацтву ўвогулле. А ў 2007 годзе па ініцыятыве вучня, ўжо знакамітага мастака У.В.Церабуна, у Смаргоні была ўсталявана мемарыяльная дошка настаўніку, заслужанаму дзеячу культуры Беларусі А. А. Дзяругу.

Пасля заканчэння школы ў 1965 годзе У. Церабун паступаў у Беларускі дзяржаўны тэатральна-мастацкі інстытут на аддзяленне керамікі, бо набору на аддзяленне скульптуры тады не было. Але не здаў экзамен па жывапісу, таму восенню на тры гады пайшоў служыць у рады Савецкай Арміі.

Вярнуўшыся з арміі, месяц займаўся Уладзімір Церабун на падрыхтоўчых курсах і паступіў у Беларускі дзяржаўны тэатральна-мастацкі інстытут на толькі што адноўленнае аддзяленне скульптуры. Пра гэты перыяд мастак успамінае:

***– Не было больш шчаслівага чалавека, чым я, калі ў 1968 годзе паступіў у інстытут на аддзяленне скульптуры. Займаўся сумленна, амаль не прапускаў заняткаў, і таму адзнакі былі някепскія. У той жа час было бачна, што вакол мяне столькі таленавітай моладзі, студэнтаў, якія прайшлі мастацкія школы, вучылішчы, што іншы раз было сорамна за сябе… Але працягваў вучобу, бо надта хацеў авалодаць майстэрствам скульптара.***

Студэнцкае жыццё было нялёгкім – жыць даводзілася на адну стыпендыю, бо бацькі не маглі аказаць яму значную падтрымку, хоць і стараліся. Кожную хвіліну выкарыстоўваў малады таленавіты мастак для працы. Пакуль ехаў у электрычцы, паспяваў зрабіць некалькі дзесяткаў накідаў у сваім невялічкім альбомчыку, а прыехаўшы дадому, раскладваў вялізныя лісты з акадэмічнымі малюнкамі і думаў, што яшчэ можна паправіць у фігуры натуршчыка.



**Мемарыяльны комплекс "Дальва" – жанчына-маці (1973)**



**Праца над МК "Дальва". 1973**

Студэнту Уладзіміру пашчасціла вучыцца ў вядомых скульптараў, народных мастакоў БССР, лаўрэатаў Дзяржаўнай прэміі БССР Андрэя Ануфрыевіча Бембеля і Анатоля Аляксандравіча Анікейчыка, скульптара Генадзя Ільіча Мурамцава і жывапісца Уладзіміра Маркавіча Пасюкевіча (вёў прадмет "Малюнак").

Каб дабіцца поспеху, аднаго таленту мала, трэба яшчэ вялікая працаздольнасць і патрабавальнасць да сябе. Усё гэта было ў Валодзі Церабуна. І поспех не заставіў сябе доўга чакаць. Ужо на трэцім курсе да маладога скульптара прыйшла першая творчая перамога. Ён выйграў конкурс на стварэнне мемарыяльнага комплексу «Дальва», аб'яўлены сярод студэнтаў. Яго праект быў прызнаны лепшым.

У аснове праекта мемарыяльнага комплексу «Дальва» У. Церабуна – вобраз беларускай жанчыны-маці, да якой у жаху ад убачанага прыціскаецца аголены хлопчык. Ён цудам уцалеў у

спаленай вёсцы, якую напаткаў лёс вядомай усяму свету Хатыні. Гэтага хлопчыка Уладзімір Церабун ляпіў з вучня мясцовай Акалоўскай школы Васі Пятрухіна.

Праца над скульптурамі мемарыяльнага комплексу была нялёгкай. Вялікае сялянскае гумно ў вёсцы Мятлічыцы, якая знаходзіцца ў 7 км ад былой вёскі Дальва, стала творчай майстэрняй. Некалькі тон гліны было перапрацавана на чатырохмятровую фігуру. Спачатку маладому мастаку Церабуну дапамагаў аднакурснік Мікола Кавалёў, але гэта было нядоўга, і праз пэўны час той пакінуў будаўніцтва. Усе фізіка-матэматычныя разлікі, каб вытрымаў каркас, шматтонная гліняная фігура не асела, Уладзімір рабіў самастойна.

Помнік прыняла экзаменацыйная камісія Беларускага дзяржаўнага тэатральна-мастацкага інстытута, у якую уваходзілі А. А. Бембель, А. А. Анікейчык, Г. Х. Вашчанка, П. С. Крахалёў і іншыя выкладчыкі. Старшынёй камісіі быў рэктар аналагічнага інстытута з Кіева. «Дальву» залічылі за дыпломную работу і паставілі самую высокую адзнаку. Гэта быў першы выпадак за 20 гадоў кафедры скульптуры Беларускага дзяржаўнага тэатральна-мастацкага інстытута, калі дыплом студэнта выконваўся ў матэрыяле і на месцы. За гэту работу Уладзімір Церабун быў адзначаны Прэміяй Ленінскага камсамола Беларусі (1976 год). Ён успамінае:



***– Гэта не проста пачатак творчай дзейнасці. Перш за ўсё – гэта іспыт даверу, гэта доказ самому сабе, гэта адказнасць і першы вопыт манументальнага будаўніцтва. Сем месяцаў працы ў перыяд студэнцкіх канікул чацвёртага і пятага курсаў. Выхадных дзён амаль не было. Мемарыяльны комплекс не быў бы пабудаваны без дапамогі ініцыятара гэтага будаўніцтва, адзінага жыхара вёскі Дальва, цудам уцалеўшага 19 чэрвеня 1944 года, М. Гірыловіча, дырэктара саўгаса «Іскра», на тэрыторыі якога знаходзіцца помнік, У. Буйневіча. На працягу будаўніцтва жыў у вёсцы Мятлічы, што ў сямі кіламетрах ад мемарыяла, у сям'і Акуліч. Комплекс існуе больш за сорак год. Здаецца, памылкі няма, ёсць пэўны гонар.***

У 2005 годзе У. Церабуном быў распрацаваны праект рэканструкцыі комплекса “Дальва”. Паступова былі зроблены рэстаўрацыя і рамонт мемарыялу: гранітам абліцавана сцяна памяці, перакампанаваны тэксты, рэстаўрыравана выкалатка з медзі, пакладзена з пліткі алея ўздоўж спаленых дамоў, вылеплены і адліты з чыгуна пяць новых нацюрмортаў, усталяваны азярод і арэлі з дрэва.



У творчай майстэрні. Гродна.

Пасля заканчэння інстытута ў 1973 годзе Уладзімір Церабун увосень пераязджае ў Гродна. На 27 гадоў звязаў сваё жыццё мастак з наднёманскім горадам. Тут атрымаў майстэрню, тут пачалося яго прафесійнае творчае жыццё. У гэты перыяд і пасля ад’езду ў 2001 годзе ў Мінск мноства твораў скульптара былі створаны і знаходзяцца ў Гродна і Гродзенскай вобласці. Сярод іх:

- скульптурная кампазіцыя «Расстраляная песня. Памяці Віктара Хары», 1976. Сілумін;

- мастацкае афармленне Палаца піянераў і школьнікаў (цяпер Цэнтр творчасці дзяцей і моладзі «Прамень») у г. Гродна, 1977. Гіпс (інтэр'ер), выкалатка з алюмінію (экстэр'ер);
- скульптурная кампазіцыя «Заўсёды на варце», 1979. г. Гродна, вайсковыя могілкі. Выкалатка з медзі і алюмінію;
- скульптурная кампазіцыя «Ісус Хрыстос», 1986. Гродна, Бернардзінскі кляштар. Гіпс;


"Расстраляная песня" памяці Віктара Хары (1976)

- мастацкае афармленне басейна санаторыя «Жамчужына» ААТ "Гродна АЗОТ", 1989. г. Гродна. Бетон, смальта;
- скульптурная кампазіцыя «Ветразь» для гасцініцы «Турыст» у Гродна, 1992. Бетон, эпаксідныя смолы;
- скульптурная кампазіцыя «Крылатая»: супрацоўнікам міліцыі, якія загінулі пры выкананні службовага і воінскага абавязкаў (у суаўтарстве з А. Крахалёвым). Гродна, 2004. Бронза, граніт;
- скульптурная кампазіцыя «Дрэва жыцця», г.п. Вялікая Бераставіца, Гродзенская вобл, 2006. Бронза, гранит;
- скульптурная кампазіцыя «Свіцязянка», Навагрудскі раён, возера Свіцязь, 2007. Бронза, граніт;
- скульптурная кампазіцыя «Клёкат буслоў» да 500-годдзя заснавання горада Скідзеля, г.Скідзель, Гродзенскі раён, 2008. Бронза, граніт;
- скульптурная кампазіцыя анімалістычнага жанру да 750-годдзя заснавання г. п. Зэльва (ў суаўтарстве з Я.Колчавым), 2008. Бронза, граніт;
- памятны знак «Рэха вайны» воінам-інтэрнацыяналістам Смаргоншчыны, якія загінулі пры выкананні воінскага абавязку, г. Смаргонь, 2013. Бронза, граніт;
- памятны знак «Пайшлі ў бессмяроцце» воінам-інтэрнацыяналістам Слонімшчыны, загінуўшым пры выкананні воінскага абавязку, г. Слонім, 2014. Бронза, граніт.

У 1985 годзе на Сусветным фестывалі моладзі і студэнтаў у Маскве Уладзімір Васільевіч атрымаў срэбраны медаль за скульптурную кампазіцыю «Расстраляная песня» памяці чылійскага барацьбіта Віктара Хары.

Акрамя творчай працы Уладзімір Васільевіч актыўна займаўся грамадскай дзейнасцю. Двойчы яго выбіралі дэпутатам Гродзенскага гарадскога Савета народных дэпутатаў. Ён быў узнагароджаны Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР і медалём «За працоўную доблесць». З 1979 года па 1987 год У.В. Церабун быў старшынёй абласнога аддзялення Беларускага Саюза мастакоў. У 1989 годзе стварыў нефармальнае аб'яднанне мастакоў – кааператыў «Рунь», які ў 1992 годзе трансфармаваўся ў Фонд свабоднага сучаснага мастацтва. Уладзімір Церабун быў старшынёй званага фонду ў перыяд з 1991 да 1995 года. За пяць гадоў існавання абедзве арганізацыі правялі 36 мастацкіх выстаў.

Пра гродзенскі перыяд творчай дзейнасці скульптара прафесар Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў ***Яўген Шунейка*** напісаў:

***«Яго творчая біяграфія звязаная са значнымі перыядамі ў развіцці беларускай скульптуры, калі гэты від мастацтва ў нас дасягнуў вялікіх прафесійных вяршыняў. Скульптар, можна сказаць, стаў культавай асобай сярод творчай інтэлігенцыі Гродзеншчыны: быў бясспрэчным лідэрам мастацкага жыцця, пэўны час узначальваў абласную арганізацыю Беларускага саюза мастакоў, ініцыятарам развіцця розных наватарскіх форм у скульптурным аздабленні горада і вобласці. Пра гэта сведчыць яго мастацкае вырашэнне Палаца піянераў і школьнікаў у Гродна (1977),***

***манументальна-дэкаратыўнае аздабленне гродзенскага санаторыя "Жамчужына" (1989), кампазіцыя са шкла і метала ў дзіцячым садку калгаса Дубна ў Мастоўскім раёне (1991) і інш.***



Ясь і Яніна (1987)

***Шмат выстаўляўся У. Церабун на гродзенскіх, рэспубліканскіх выставах і за мяжой, як творца станковых і дэкаратыўных кампазіцый. Этапнымі сталі яго творы "Расстраляная песня. Памяці Віктара Хары" (1976), "Апошняе жніво" (1981), "Жалейка" (1987), "Ясь і Яніна" (1987), "Апостал Павел" (1993) і інш.***

***Яго скульптурны аўтарскі стыль пачаў пазнавацца адразу, дзякуючы мяккай і рэалістычнай трактоўцы формы, выяўленню глыбокай эмацыйна-псіхалагічнай характарыстыцы герояў. Усё складалася вельмі паспяхова, але творца неўзабаве перарос тое асяроддзе, з якім звязана яго творчае сталенне, назапашванне неабмежаванага творчага вопыту. Ён вырашыў развітацца са сваёй ўтульнай гродзенскай майстэрняй на вуліцы Горкага, якая была сапраўдным цэнтрам творчых сустрэч і своеасаблівым арт-салонам, і ў 2001 годзе пераехаў у Мінск, дзе пачынаецца яго яшчэ больш актыўны манументальны перыяд скульптурнай дзейнасці».***

Так, у 2001 годзе Уладзімір Церабун пераехаў у Мінск, але сувязь з Гродзеншчынай не згубіў. Пералік работ, якія ўсталяваны ў Гродна, Скідзелі, Смаргоні, Зэльве, В. Бераставіцы сведчыць пра гэта.

Ураджэнец Смаргоншчыны, Ганаровы грамадзянін горада Смаргонь, Уладзімір Церабун не забывае ніколі сваю малую радзіму. Задумы наконт упрыгожання скульптурай роднага горада з'явіліся даўно. У Смаргоні, дзе мастак правёў сваё дзяцінства, куды часта прыязджае ў бацькоўскую хату, знайшлі сваё ўвасабленне сем аўтарскіх і калектыўных (з удзелам мастака) манументальных твораў:

- скульптурная кампазіцыя пры ўездзе ў г. Смаргонь, 2003;
- юбілейны знак «500-годдзе горада Смаргонь», у суаўтарстве з А. Крахалёвым, 2003. Граніт;
- мемарыяльная дошка Заслужанаму дзеячу культуры Беларусі Аляксандру Дзяругу, 2007. Бронза;



"Мядзведжая акадэмія"(праект). г. Смаргонь (2013)





“Мядзведжая акадэмія”.
Урачыстасці з нагоды адкрыцця помніка. г.Смаргонь, 2014 год.

- мемарыяльныя дошкі хірургам В. Новікаву, Д. Шавялёву, Ч. Цярэшку, 2006. Сілумін;
- помнік воінам-інтэрнацыяналістам «Рэха вайны», 2013. Камень;
- скульптурная кампазіцыя «Мядзведжая акадэмія», 2014. Чыгун;
- мемарыяльны комплекс ушанавання ахвяр Першай сусветнай вайны, у суаўтарстве з калектывам пад кіраўніцтвам А. Арцімовіча, 2014- .

Самым значным скульптурным упрыгожаннем Смаргоні, Беларусі, наогул Еўропы, над праектаваннем і будаўніцтвам якога з 2006 года па запрашэнні скульптара А. Арцімовіча працаваў У. Церабун, стаў мемарыяльны комплекс на лініі супрацьстаяння ў Першую сусветную вайну 1915-1917 гг.

Ідэя стварэння помніка з'явілася ў скульптара яшчэ ў 1986 годзе, але толькі праз 20 год Смаргонскі раённы выканаўчы камітэт падтрымаў прапанову стварэння мемарыялу. Смаргонскі райвыканкам ў 2006 годзе аб'явіў рэспубліканскі творчы конкурс. На конкурс было прадстаўлена 9 праектаў. Пераможцам стаў аўтарскі калектыў скульптара, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь Анатоля Арцімовіча. Пазней А. Арцімовіч запрасіў Уладзіміра Церабуна да сумеснай работы. Не пагадзіцца з такой прапановай было нельга. Праца па стварэнню комплекса была доўгай і карпатлівай, а да поўнага завяршэння работ пройдзе яшчэ шмат часу.




Мемарыяльны комплекс размясціўся ў гарадскім парку Перамогі г. Смаргонь. Гэта алея даўжынёю 410 метраў. Састаўной часткай уваходнай групы з'яўляецца зона памяці і смутку, у цэнтры якой – трохмятровая ў дыяметры бронзавая карта ваенных падзей 1915-1917 гадоў, якія адбываліся на Смаргоншчыне. Побач – дзве мемарыяльныя ўрны з зямлёй з месцаў пахавання воінаў рускай і нямецкай армій. Па абодва бакі карты – гранітныя сцены памяці, дзе будуць размешчаны імёны рускіх салдат, нямецкіх салдат, якія загінулі на смаргонскай зямлі. Прадаўжае зону памяці і смутку трынаццацімятровая капліца, у верхняй частцы якой – звон з Георгіеўскім крыжам.



“Крылаты геній салдацкай славы”

“Салдаты Першай сусветнай вайны”





“Бежанцы”

Цэнтральная частка кампазіцыі ўяўляе сабой трыпціх: магутная каменная глыба з шасціметровай скульптурай «Крылаты геній салдацкай славы», абапал – дзве бронзавыя скульптуры «Салдаты Першай сусветнай» і «Бежанцы». У канцы алеі – камень-валун са зваротам да нашчадкаў на рускай і нямецкай мовах: «Любая вайна нясе гора, разбурэнні і смерць. Наш святы абавязак – памятаць пра гэта». Перад скульптурнымі кампазіцыямі размясціліся семь валуноў з бронзавымі медальёнамі, на якіх пералічаны ваенныя падзеі на Смаргонскай зямлі ў тыя трагічныя гады.

Першая частка мемарыяльнага комплексу была ўрачыта адкрытая 1 жніўня 2014 года ў гонар 100-годдзя пачатку Першай сусветнай вайныз удзелам у мітынгу-рэквіеме высокіх дзяржаўных асоб Беларусі, Расіі, прадстаўнікоў іншых краін. Па задумцы аўтараў, другая частка комплексу размесціцца ў раёне вёскі Хадакі, на трасе Мінск-Вільнюс, дзе захаваліся фартыфікацыйныя збудаванні – 17 нямецкіх дотаў. Заключным акцэнтам комплексу павінна быць скульптурная кампазіцыя «Праклён вайне». Надаць мемарыялу канчатковы выгляд плануецца ў 2018 годзе да 100-годдзя заканчэння Першай сусветнай вайны.

Пра сваю працу на карысць роднай Смаргоні Уладзімір Церабун разважае:

***–Ці быць Смаргоні горадам-помнікам? Такая роля наканавана маёй малой радзіме самой гісторыяй. Ганаруся, што ў складзе аўтарскага калектыву распрацоўваў праект і займаўся будаўніцтвам мемарыяльнага комплексу па лініі супрацьстаяння ў гады Першай сусветнай вайны.***

Талент Уладзіміра Васільевіча Церабуна праяўляе сябе не толькі ў скульптуры. У яго руках ажываюць і гліна, і аловак, і пэндзлік з фарбамі, і музычныя інструменты.

У жывапісе (пейзаж) У. Церабун працуе з 1996 года. Працы яго знаходзяцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі, фондах Беларускага саюза мастакоў, Гродзенскім гісторыка-археалагічным музеі, Смаргонскім краязнаўчым музеі і іншых музеях. Мастак выказваецца:

***–Кожны матэрыял – алей, акварэль, – мае ўласцівасці. Скарыстаць іх і выказаць пачуцці, уражанні – гэтага я імкнуўся дасягнуць у сваіх жывапісных памкненнях. З дзяцінства захапляўся краявідамі Смаргоншчыны і Беларусі ўвогулле. Марыў навучыцца маляваць фарбамі. Рабіў копіі з твораў І. Шышкіна. Нешта атрымоўвалася, але хацелася свайго.***

Сваё захапленне прыродаю родных мясцін Уладзімір Церабун выказаў у шэрагу жывапісных работ з цыклу «Край мой родны».

**Церабун У.В. Цыкл работ "Край мой родны"**











Шмат гадоў Уладзімір Васільевіч займаецца керамікай. Пра сваё захапленне мастацтвам вырабаў з гліны гаворыць наступнае:

***–Спачатку набыў ганчарны круг без рухавіка ў Поразаве – на гістарычнай радзіме керамікі, у братоў Шопікаў. Вельмі захапіўся гэтай справай і амаль сем гадоў не пакідаў гліны. Хацеў аб'яднаць кераміку і скульптуру…***



Вынікам працы спачатку былі простыя вясковыя гаршкі. Пазней на іх сценках пачалі з'яўляцца лісточкі, кветкі, галінкі. Потым яны пачалі трансфармавацца ў сасуды-скульптуры, набываючы формы чалавечага цела. Пра гэтыя творчыя работы вельмі трапна і прыгожа выказаўся вядомы скульптар, педагог **Аляксандр Ларыёнаў**:

***«Сасуды Церабуна трансфармаваліся ў сасуды-скульптуры. Адбыўся сімбіёз злітнасці дзвух уласцівасцей. Гульня мужчынскага і жаночага пачаткаў, гэтых інь і янь усходняе пачуццёвае філасофіі,***



***ператорана скульптарам у эстэтычным вобразе юнака і дзяўчыны. У рэльефе, месцамі высокім, гатовым вось-вось адлучыцца ад свайго сасуда, перададзены майтстрам векавечныя ўласцівасці гэтага "танца кахання". Скульптурнасць, вылепленасць твора не толькі не спрачаецца з традыцыйнымі формамі сасуда, але, наадварот, стварае тонка мадэляванымі, чуйнымі абрысамі ўсё яе непаўторнае хараство».***



Церабун У.В. “Сымон-музыка”

А. Ларыёнаў адзначае адну з самых ўдалых работ У. В. Церабуна ў жанры станковай скульптуры: ***«Нязменна, тэмаю кахання праз усю творчасць Уладзіміра Церабуна прайшоў вобраз Сымона-музыкі. Развязаны яшчэ напрыканцы 70-х гадоў у дрэве і паказаны на шматлікіх выставах, ён, па сутнасці, стаў эмблемаю скульптара і, вядома, не мог не ўвасобіцца на новым этапе яго творчасці ў кераміцы. Узнік сасуд-скульптура “Сымон-музыка”, адзін з найбольш удалых, на мой погляд, твораў майстры. Коласаў, а пасля і народны вобраз юнага музыкі – душы свету, якая злучана з прыродаю незлічальнымі сувязямі – гэта фактычна размова пра найгалоўнейшае ў мастацтве: пра шчырасць, гармонію, красу. Пра дзіцячасць. Жыць ва ўнісон з прыродаю, быць чуйным да рытмаў космасу, да паэтычных рытмаў, а таму сасуд, з якога праступае чуйная да свету, укленчаная постаць хлопчыка – alter ego самога майстры».***

За сваю ужо больш як 40-гадовую творчую працу Уладзімір Церабун правёў 16 персанальных выстаў. Яго работы экспанаваліся не толькі ў розных гарадах Беларусі, але і ў Расіі, Польшчы, Германіі, Літве, Латвіі, Эстоніі. Творы станковай скульптуры і дробнай пластыкі У. Церабуна таксама можна пабачыць у Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь, Дзяржаўным літаратурным музеі Янкі Купалы, Дзяржаўным літаратурна-мемарыяльным музеі Якуба Коласа, Фондзе Беларускага Саюза мастакоў, Гродзенскім дзяржаўным гісторыка-археалагічным музеі, Гудзевіцкім дзяржаўным літаратурна-краязнаўчым музеі. Больш за 50 твораў знаходзяцца ў Смаргонскім краязнаўчым музеі.

Але шматлікія задумы Уладзіміра Церабуна знайшлі сваё ўвасабленне толькі як праекты на паперы ці ў пластылінавай мініяцюры. Менавіта яны сталі экспанатамі персанальнай выставы «Няспраўджаныя мроі ў творчасці маей» (2012 год), прысвечанай 40-годдзю творчай дзейнасці скульптара.



У 2014 годзе Уладзімір Церабун працаваў над новым выданнем фотаальбома «На хвалях часу», прысвечаным сваёй творчасці. Альбом быў прэзентаваны ў горадзе Гродна і горадзе Смаргонь ў студзені і лютым 2015 года.





Гродзенская гарадская цэнтральная бібліятэка імя А. Макаёнка у 2014 годзе адкрыла віртуальны **Музей жыцця і творчасці скульптара У. В. Церабуна**. Матэрыял збіраўся і кампанаваўся ў цесным супрацоўніцтве з героем музею, за што бібліятэкары вельмі ўдзячны Уладзіміру Васільевічу. Залы віртуальнага музею можна наведаць на сайце бібліятэкі па адрасе: **http://centrbibl.grodno.by/museum/terabun/index.htm.**



На пытанне карэспандэнтаў «Маладзечанскай газеты» за 29.01.2015 наконт колькасці творчых работ і планаў мастака на будучае, Уладзімір Церабун даў такі адказ:

***–Статыстыка ў мастацтве не самая лепшая характарыстыка не тое што таленту, але нават здольнасцей творцы. Але калі такое пытанне з'явілася, то адкажу. У прафесійным багажы налічваецца больш за 2000 работ. Гэта і манументальныя аб'екты, і станковая скульптура, і эталоны керамікі, і жывапісныя творы – карціны, малюнкі. Некаторыя з іх можна лічыць «дзецьмі» настрою і натхнення – кожны ж дзень не будзеш ляпіць. Мастак імкнецца выказаць сябе ў розных жанрах – і гэта нармальны стан неабыякавай душы.***

***Я падыходжу да сваіх работ манументальнага характару не як да звычайнай ілюстрацыі таго альбо іншага факта, нейкай падзеі, а як да сімвала, да якога б людзі ішлі так, як вернікі ідуць да крыжа. Мастацтва – зварот мастака да гледача, спроба праз твор абудзіць у чалавеку лепшыя пачуцці.***

***Мне ўвесь час падабалася ляпіць, майстраваць, маляваць. А яшчэ люблю музыку – яна была маім хобі, ім і засталася. У Мінску, дзе жыву цяпер, ёсць гітара, і ў Смаргоні, у бацькоўскай хаце, цудоўны інструмент маю. І на балалайцы іграю, і на цымбалах, і на фартэпіяна. Вядома, як аматар. Люблю фатаграфаваць. За такое стаўленне да жыцця ўдзячны сваім бацькам, а таксама зямельцы, на якой нарадзіўся і жыву, якая сілкуе душу і розум. Дае творчае натхненне.***

Біяграфічны нарыс дарэчы будзе завяршыць словамі мастака **Аляксандра Ларыёнава** (1994 г.): ***«Ёсць таленты, якія прыходзяць у свет з прадказальнасцю грыбнога дажджу ў верасні. Прыроднасць і заканамернасць такога дару настолькі відавочная, што "даджовая" метафара не здаецца паэтычнаю вольнасцю і цалкам суадносіцца з тым новым, што з'явілася за апошнія гады ў творчасці скульптара Уладзіміра Церабуна. Яго імя добра вядомае ў краіне. ...Церабун пазбягае слова "натхненне", аддаючы перавагу "працы". Ён не чакае нябёснае інспірацыі. Праца кожнага дня – вось умова яго творчых набыткаў. І бясконцая (хочацца думаць так) "лава" сасудаў, скульптур "выліваная" з яго майстэрні, сведчыць, што Бог любіць апантаных».***

Няхай жа і надалей працаўніка і творцу Уладзіміра Васільевіча Церабуна любіць і абараняе Бог.



За работай над скульптурай апостала Пятра, 1994 г.





Скульптар у працоўных буднях XXI стагоддзя



## Пералік нявдзейсненых праектаў

1. Праект памятнага знаку «Героям падпольшчыкам» – 1975 г.
2. Праект скульптурнай кампазіцыі «Прясвячэнне С. В. Прытыцкаму» для г. Гродна – 1979-1980 гг.
3. Праект памятнага знаку абаронцам Айчыны «Кожны чацвёрты» – 1981 г.
4. Праект памятнага знаку ахвярам вайны 1941-1945 гг. «Вогнішча вайны» в. Гудзевічы Мастоўскага раёна – 1981г.
5. Праект памятнага знаку «Апошняе жніво», прысвечанага памяці жыхароў в. Алексічы Хойніцкага раёна, загінуўшых у жніўні 1943 года – 1981 г.
6. Праект памятнага знаку «Героям Чарнобыля» для г. Масквы (конкурс) – 1988 г.
7. Праект скульптурнай кампазіцыі «За Радзіму!» абаронцам г. Масты (I варыянт) – 1988 г.
8. Праект памятнага знаку «Яны абаранялі Радзіму» для калгаса «Светлы шлях» Смаргонскага раёна (скульптуры адліты ў бронзе h-140 см. Не ўстаноўлены, не змаглі выканаць архітэктуру (архітэктар Пешкаў Г. А.) – 1989 г.Праект помніка Францішку Багушэвічу для г. Смаргоні – 1990 г.



Праект скульптурнай кампазіцыі, прысвечанай Максіму Багдановічу, для г.Гродна, 2012

9. Праект скульптурнай кампазіцыі «Кірыл Тураўскі» для БДУ г. Мінска (конкурс, на тэрыторыі універсітэта) – 2000 г.
10. Праект скульптурнай кампазіцыі «Жнівень» (з цыкла поры года): паркавая скульптура для г. Гродна – 2001 г.
11. Праект надмагільнага помніка У. Мулявіну (конкурс) – 2003 г.
12. Праект фантана для г. Ваўкавыска, прысвечанага 1000-годдзю заснавання горада (конкурс, суаўтары А. Крахалёў, Ю. Багушэвіч, праект не захаваўся) – 2004 г.
13. Праект скульптурнай кампазіцыі «Бег» для Мінск-Сіці – 2005 г.
14. Праект скульптурнай кампазіцыі «Прясвячэнне слуцкім майстрам ткацтва» для г. Слуцка – 2005 г.
15. Праект скульптурнай кампазіцыі «Кастусь Каліноўскі» – 2005 г.
16. Праект скульптурнай кампазіцыі «На Купалле» для фантана ў г. Гродна (конкурс) – 2006 г.
17. Праект скульптурнай кампазіцыі «Трубяць трубы Гарадзенскія» – 2006 г.
18. Праект скульптурнай кампазіцыі «Дзяўчына з вавёркамі» для фантана ў г. Гродна (Гараднічанка) – 2007 г.
19. Праект скульптурнай кампазіцыі «Ветразь» для фантана ў г. Гродна - 2007 г.
20. Праект мемарыяльнага комплексу «Памяці продкаў», памяці жыхароў в. Пузавічы Гродзенскага раёна (конкурс) – 2008 г.
21. Праект скульптурнай кампазіцыі «Інь і Янь» для ЗАГСа г. Гродна (конкурс) – 2008 г.
22. Праект скульптурнай кампазіцыі «Чэмпіёны Гродзеншчыны» для г. Гродна – 2009 г.

**23.** Праект мастацкага афармлення санаторыя «Свіцязь» (экстэр’ер, інтэр’ер), добраўпарадкаванне (прысвячэнне А. Міцкевічу) – 2009 г.

**24.** Праект надмагільнага помніка В. Крамко (Герой Беларусі) (конкурс) - 2009 г.

**25.** Праект скульптурнай кампазіцыі «Свята Ураджаю» для аграрнага ўніверсітэта г. Мінска – 2009 г.

**26.** Праект скульптурнай кампазіцыі «Мацярынства» для радзільнага Дома ў г. Гродна – 2010 г.



Скульптурная кампазіцыя “Вясне насустрач “ для іпадрома ў в. Каробчыцы (Гродзенскі раён), 2010.

**27.** Праект скульптурнай кампазіцыі «Бег часу» да 60-годдзя заснавання калгаса «Прагрэс» в. Верцялішкі Гродзенскага раёна – 2010 г.

**28.** Праект помніка Янку Купалу і Якубу Коласу для г. Варшавы (конкурс) – 2010-2011 гг.

**29.** Праект скульптурнай кампазіцыі «Вясне насустрач» для іпадрома в. Каробчыцы (Гродзенскі раён) – 2010 г.

**30.** Праект скульптурнай кампазіцыі «Танец» і «Папараць кветка» для г. Маладзечна (Дажынкі) – 2011 г.

**31.** Праект скульптурнай кампазіцыі «Атака» для Мінскдарбуда (конкурс) – 2011 г.

**32.** Праект скульптурнай кампазіцыі «Феміда» для прыватнага інстытута правасуддзя ў г. Гродна – 2011 г.

**33.** Праект скульптурнай кампазіцыі «Прысвячэнне» Максіму Багдановічу для г. Гродна (конкурс) – 2012 г.

**34.** Праект памятнага знаку да 500-годдзя заснавання Скідзельскага цукровага камбіната – 2012 г.

**35.** Праект памятнага знака «Крэўская Унія» для в. Крэва Смаргонскага раёна Гродзенскай вобласці – 2013 г.

**36.** Праект памятнага знаку воінам-інтэрнацыяналістам, якія загінулі пры выкананні воінскага абавязку, «Абпаленыя вайной» для г. п. Астравец Гродзенскай вобласці – 2014 г.

## Пералік персанальных выстаў

**1986 – сакавік** – першая прсанальная выстава да 40-годдзя з дня нараджэння; прадстаўлена 145 работ: скульптура, малюнак, а таксама фотарэпрадукцыі манументальных твораў (г. Гродна, выставачная зала БСМ).

**1986 – май** – персанальная выстава; прадстаўлена 56 работ: скульптура, дробная пластыка, малюнак (г. Друскінінкай, санаторый «Літува», Літва).

**1986 – чэрвень** – персанальная выстава; прадстаўлена 70 работ: скульптура, дробная пластыка, малюнак (г. Смаргонь, Гродзенская вобласць, гістрыка-краязнаўчы музей).

**1987 – сакавік** – персанальная выстава; прадстаўзлена 70 работ: скульптура, дробная пластыка, малюнак (г. Дубна, Маскоўская вобласць, Палац культуры).

